PolotskSU





УДК 94(4)

# УПЛЫЎ ПАМЕЖНАГА СТАНОВІШЧА НА ПАЛІТЫЧНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ ШЛЯХЕЦКІХ КАРПАРАЦЫЙ ПОЛАЦКАГА І ВІЦЕБСКАГА ВАЯВОДСТВАЎ (1558–1607 гг.)

*У. ПАДАЛІНСКІ*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*Даследаванне прысвечана праблеме грамадскай дзейнасці мясцовых палітычных элітаў у сітуацыі памежжа ва ўмовах вайны і ў мірны час. Робіцца выснова аб тым, што становішча Полацкага і Віцебскага ваяводства на мяжы з Масковіяй непасрэдна вызначала прыярытэты ў палітычнай дзейнасці мясцовых дваранскіх абшчын. Дваранства надавала першапачатковую ўвагу эфектыўнаму забеспячэнню абараназдольнасці замкаў, нармалізацыі адносін з ваярамі і абароне маёмасных правоў дваран. У артыкуле сьцьвярджаецца, што полацкія і віцебскія дваранскія карпарацыі разглядалі сябе як асаблівую групу палітычнай нацыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Вынікі даследавання важныя для ўсебаковага даследавання палітычнай гісторыі ВКЛ, а таксама мясцовых элітаў і органаў мясцовага самакіравання ў другой палове XVI-пачатку XVII ст.*

У выніку войнаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай на пачатку XVI ст. землі сучаснай паўночна-ўсходняй Беларусі апынуліся ў памежным становішчы. На працягу наступных дзесяцігоддзяў беларускае Падзвінне, як і Падняпроўе і Пасожжа, неаднаразова станавілася арэнай жорсткіх баявых сутыкненняў. Знаходжанне на такім неспакойным памежжы непасрэдна ўплывала на паўсядзённую свядомасць і грамадскую дзейнасць мясцовага насельніцтва. У другой палове XVI ст. усходнія землі ВКЛ перажылі надзвычай цяжкую Інфлянцкую вайну (1558–1582 гг.). Пасля яе завяршэння наступіў перыяд адноснага спакою, які цягнуўся да пачатку XVII ст. Аднак у 1607 г. распачаўся паход Ілжэдзмітрыя ІІ на Маскву, які *de facto* стаў прадвеснікам новай вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай, афіцыйна абвешчанай у 1609 г. За мэту нашага даследавання быў пастаўлены аналіз асаблівасцяў палітычнай дзейнасці шляхецкіх супольнасцяў Полацкага і Віцебскага ваяводстваў у 1558–1607 гг., якія вызначаліся памежным становішчам рэгіёну, прычым, як у ваенных умовах, так і ў мірны час.

Айчынныя даследчыкі даволі грунтоўна вывучаюць гісторыю беларускага Падзвіння і Падняпроўя перыяду ранняга Новага часу (XVI–XVII стст.). Даўнюю і багатую традыцыю мае вывучэнне мінулага гарадоў і іншых адміністрацыйных цэнтраў паўночна-ўсходняй Беларусі[7]. Сур’ёзна даследуецца і сацыяльна-палітычная гісторыя Полацкай

[7] Дук Д.У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.). Наваполацк, 2010; Левко О.Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: формирование и развитие. Минск, 2004; Макараў М.Дз. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV–першай палове XVII ст. Мінск, 2008; Марзалюк І.А. Магілёў у XII–XVIII стст. Людзі і рэчы. Магілёў-Мінск, 1998; Мелешко В.И. Могилев в XVI–середине XVII в. Минск, 1988.

PolotskSU



зямлі (ваяводства). Асаблівасці развіцця Полаччыны ў складзе Вялікага Княства Літоўскага яшчэ да заключэння Люблінскай уніі 1569 г. разгледжаны ў працах У. Пічэты, В. Вароніна, М. Спірыдонава[8]. Існуюць таксама пэўныя напрацоўкі ў вывучэнні шляхецкай супольнасці Полацкага ваяводства канца XVI–XVII стст.[9] Значны ўнёсак у даследаванне розных аспектаў жыцця полацкай шляхты зрабіў беларускі гісторык В. Галубовіч[10]. З іншага боку, палітычная гісторыя Віцебскага ваяводства, якое складалася з Віцебскага і Аршанскага паветаў, і мясцовыя эліты фактычна не вывучаліся. Увогуле, можна канстатаваць, што у гістарыяграфіі да гэтага часу няма комплекснага даследавання палітычнай дзейнасці шляхецкіх эліт Полацкага і Віцебскага ваяводстваў у другой палове XVI–пачатку XVII ст.

Важнейшымі крыніцамі для вывучэння палітычнай дзейнасці шляхты ВКЛ з'яўляюцца разнастайныя пастановы, што прымаліся на ўсіх узроўнях парламенцкай сістэмы дзяржавы. Вынікі такой дзейнасці адлюстроўваюць ухвалы вальных соймаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай[11], а таксама Галоўных з'ездаў ВКЛ і розных з'ездаў часоў бескаралеўя[12]. Вельмі каштоўнымі дакументамі, якія дазваляюць вызначыць стаўленне шырокіх колаў шляхты Вялікага Княства да актуальных праблем грамадска-палітычнага жыцця, з'яўляюцца інструкцыі і пастановы павятовых соймікаў. На жаль, для даследуемага перыяду захаваліся адзінкавыя соймікавыя ўхвалы, прынятыя

---

[8] Варонін В. Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. // Беларускі гістарычны агляд. Т. 5, сш. 1 (8). 1998. С. 27–64; Ён жа. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст.: Дыс. на суіск. вуч. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02; БДУ. Мінск, 2000; Пичета В.И. Белоруссия и Литва XV–XVI в. (Исследования по истории соц.-экон., полит. и культ. развития). М., 1961; Спірыдонаў М. Полаччына ў сярэдзіне XVI ст. // Commentarii Polocenses Historici-Полацкія гістарычныя запіскі. Т.1. 2004. С. 5–19.

[9] Гл. напр.: Бортнік І.А. Сацыяльна-палітычныя каштоўнасці і нормы паводзін шляхты Полацкага ваяводства ў канцы XVI–пачатку XVII стст. паводле соймікавых інструкцый // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы VI Міжнар. навук. канф. (1–3 лістапада 2012 г.): у 2 ч. Ч. 1. Полацк, 2013. С. 41–53; Падалінскі У. Соймавае прадстаўніцтва Полацкага ваяводства ў канцы XVI ст. Спроба аналізу // Полацкі музейны штогоднік: (зборнік навуковых артыкулаў за 2010 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева, А.У. Шумовіч, Т.Р. Смірнова. Полацк, 2011. С. 155–163; Радаман А. Арганізацыя і склад полацкага земскага суда ў другой палове XVI–першай трэці XVII ст. // Герольд-Litherland. №18. Горадня-Менск, 2011. С. 21–36; Якубаў В. Міжканфесіянальныя канфлікты ў Полацкім ваяводстве (1550–1618 гг.) // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. Вып. 2. Мінск, 2009. С. 175–185.

[10] Галубовіч В. Полацкія ваяводы ў XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. №11. С. 37–42; Ён жа. Паслы Полацкага ваяводства ВКЛ на соймы Рэчы Паспалітай у 1558–1668 гг. // Герольд-Litherland. №18. Горадня-Менск, 2011. С. 37–40; Ён жа. Miscellanea historica polocensia = Даследаванні па гісторыі Полаччыны XII–XVII стст. Гродна, 2014; Ён жа. Полацкая шляхта і дынастыя Вазаў. Мінск, 2016. Заўважым, што ў 2005–2007 гг. В. Галубовіч з'яўляўся кіраўніком навукова-даследчага праекта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў (Г05М-190) "Лакальныя палітычныя эліты ў Вялікім Княстве Літоўскім: арганізацыя, функцыянаванне, гістарычны лёс (на прыкладзе шляхты Полацкага ваяводства ў 1588–1667 гг.)".

[11] Документы Московского архива Министерства юстиции (ДМАМЮ). Т. 1. М., 1897; Русская историческая библиотека (РИБ): Т. 30: Литовская Метрика. Отдел первый–второй. Ч. 3: Книги публичных дел / ред. И.И. Лаппо. Юрьев, 1914; Volumina Constitutionum. T. II (1550–1609), vol. 1 (1550–1585) / Do druku przygotowali S. Grodziski, I. Dwornicka i W. Uruszczak. Warszawa, 2005. T. II (1550–1609), vol. 2 (1587–1609) / Do druku przygotował S. Grodziski, przedmowa W. Uruszczak. Warszawa, 2008.

[12] Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. T. 1: Okresy bezkrólewi / Oprac. H. Lulewicz. Warszawa, 2006. T. 2: Okresy panowań królów elekcyjnych XVI–XVII wiek / Oprac. H. Lulewicz. Warszawa, 2009.

PolotskSU



ў Полацку, Віцебску і Оршы[13]. Важную інфармацыю аб сацыяльна-палітычнай дзейнасці разглядаемых шляхецкіх карпарацый у гэты час нясуць у сабе эпісталярныя крыніцы, у прыватнасці, лісты мясцовых ваяводаў і старостаў[14]. Ускосныя ці ўрыўкавыя звесткі аб патрэбах і настроях мясцовай шляхты даюць некаторыя дакументальныя матэрыялы, што захоўваюцца ў кнігах Метрыкі ВКЛ. У цэлым, комплексны аналіз інфармацыі розных крыніц дазваляе дэталёва вывучаць палітычную пазіцыю лакальных шляхецкіх карпарацый Полацкага і Віцебскага ваяводстваў у другой палове XVI–пачатку XVII ст.

Адным з самых актуальных пытанняў для шляхты беларускага Падзвіння было забеспячэнне належнай абароназдольнасці памежных замкаў. Ужо на сойме ВКЛ 1559 г., калі стала відавочна пагроза непасрэднага ваеннага сутыкнення Вялікага Княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай з-за канфлікту ў Інфлянтах[15], прадстаўнікі Полацкага і Віцебскага ваяводстваў падалі каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму Жыгімонту Аўгусту просьбу аб забеспячэнні замкаў у Полацку і Віцебску «*стрелбою и жывъностью*», г.зн. зброяй і харчаваннем. Дадаткова віцебская шляхта прасіла арганізаваць рамонт Ніжняга і Верхняга замкаў у Віцебску[16]. Вялікі князь абяцаў умацаваць замкі, атрымаўшы больш падрабязную інфармацыю ад мясцовых ваяводаў[17]. Апасенні шляхты аказаліся небеспадстаўнымі – у хуткім часе Падзвінне, Падняпроўе і Пасожжа сталі арэнай маштабных баявых дзеянняў. І калі Віцебск у маі 1562 г. здолеў стрымаць штурм маскоўскага войска, то Полацк у лютым 1563 г. аказаўся маскоўцамі захоплены пасля двухтыднёвай аблогі. У лістападзе 1564 г. імі было занята і Азярышча, што прыкрывала дарогу на Віцебск з поўначы[18]. Страта Полацка, а фактычна і ўсёй правабярэжнай Полаччыны, ускладніла становішча Віцебскага ваяводства, якое апынулася амаль з усіх бакоў аточаным варожай тэрыторыяй. У верасні 1565 г. адмысловая дэлегацыя ў асобах ротмістра Паўла Друцкага-Саколінскага, віцебскага гараднічага Пятра Кісяля і віцебскага войта Сцяпана Лускіны прасіла Жыгімонта Аўгуста арганізаваць рамонт замкаў у Віцебску і Суражы, а таксама забяспечыць іх зброяй і харчаваннем[19]. Акрамя таго, віцебскія прадстаўнікі прасілі адрамантаваць у Верхнім замку «*озерко*» для назапашвання пітной вады і прапаноўвалі, відаць, для лепшай

[13] Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie (AGAD). Archiwum Radziwiłłów (AR). Dz. II. Sygn. 301, 336, 346, 395, 396, 421, 450; Biblioteka Muzeum Narodowego im. Książąt Czartoryskich w Krakowie. Rkps. 2234. Nr. 51. Агульны змест соймікавых інструкцый Полацкага і Віцебскага ваяводстваў на вальны сойм Рэчы Паспалітай 1597 г. можна аднавіць па матэрыялах працы Галоўнага сойміка ВКЛ у Слоніме ў студзені 1597 г.: Akta zjazdów… T. 2. S. 128–132.
[14] Гл., напр., лісты аршанскага старосты Філона Кміты-Чарнабыльскага, які займаў гэтую пасаду з 1566 па 1587 гг.: Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці / Рэд. Ю.С. Пшыркоў. Мінск, 1975.
[15] Любавский М.К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства. М., 1900. С. 592–597; Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. Мінск, 2007. С. 32–38.
[16] РИБ. Т. 30. Стб. 290, 292. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 606–607.
[17] На той момант полацкім ваяводам з'яўляўся Станіслаў Давойна, а віцебскім – Стэфан Збаражскі: Wolff J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego (1386–1795). Kraków, 1885. S. 46, 87.
[18] Падрабязна аб баявых дзеяннях 1562–1564 гг. гл.: Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. С. 53–95.
[19] ДМАМЮ. С. 192–196. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 683–684. Гаспадарскі адказ быў дадзены «*княземъ, паномъ, бояромъ, шляхте и всимъ мещаномъ витебскимъ*».

PolotskSU


абароназдольнасці, ліквідаваць, «*сказити*» Ніжні горад ды перасяліць мяшчан «*межи Двины и Видьбы*»[20]. Просьбы «*около будованья и поправованья замковъ Витебского и Суражского и о спижу на тые замки*», а таксама «*о стрельбу и иншие потребы до того належачие*» віцебская шляхта (пасламі з'яўляліся земскі суддзя Іван Багушэвіч і гараднічы Пётр Кісель) паўтарыла і на вальным сойме ВКЛ 1566 г. у Берасці[21]. Гучалі таксама просьбы аб размяшчэнні ў памежных замках жывой сілы. Так, у 1565 г. Жыгімонт Аўгуст даў згоду выдаткаваць грошы на ўтрыманне 2 000 казакоў у Віцебску і 500 казакоў у Суражы[22].

Заўважым, што клопат аб баяздольнасці замкаў выяўлялі не толькі жыхары памежжа. У ваенных умовах гэтая праблема набывала ўжо агульнадзяржаўнае значэнне. Так, у 1569 г. на першым вальным сойме Рэчы Паспалітай уся дэлегацыя ВКЛ звярнулася да Жыгімонта Аўгуста з просьбай выдаткаваць сродкі на «*поправленье замку Оршанского и иныхъ замковъ граничныхъ*»[23]. Падобныя просьбы ад шляхты розных рэгіёнаў ВКЛ гучалі і ў пазнейшыя часы. Дададзім таксама, што шляхта паўночна-ўсходніх зямель Беларусі ўсведамляла і падкрэслівала важнасць памежных замкаў для абароны ўсяго Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Напрыклад, аршанскі староста Філон Кміта-Чарнабыльскі ў 1574 г. так акрэсліў стратэгічнае значэнне Оршы для абароны межаў Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай: «*Хотя ж тая Орша не ест столица, але только фортка панств государских, да только в таких службах нет ей ровни*»[24]. У 1606 г. шляхта Полацкага ваяводства ва ўхвале, прынятай на рэляцыйным сойміку, называла Полацк "*варотамі ў ВКЛ*", а віцебская шляхта ў 1598 г. акрэслівала замак у Віцебску, як "*скарб Яго Каралеўскай Міласці*"[25].

Праблема ўтрымання замкаў у належнай баяздольнасці хвалявала мясцовую шляхту і ў мірны час. Відаць, менавіта прадстаўнікі Полацкага і Віцебскага ваяводстваў у час соймавай кампаніі 1596 г. паставілі пытанне наконт забеспячэння такіх памежных замкаў, як Дзісна, Полацк і Віцебск, а таксама выплаты нарэшце жалавання "*жаўнерам замкаў ускраінных ВКЛ*"[26]. На пасяджэнні Галоўнага сойміка ВКЛ у студзені 1597 г. пасол Віцебскага павета на вальны сойм Рэчы Паспалітай мясцовы маршалак і падкаморы Юрый Друцкі-Саколінскі агучыў пастулат аб неабходнасці рамонту замка ў Віцебску[27].

[20] ДМАМЮ. С. 195–196. Дарэчы, у наступным годзе Жыгімонт Аўгуст абяцаў значныя падатковыя льготы тым жыхарам Віцебска, якія будуць «*домы свои, которие для небеспечности от огня зъ замку Нижнего и с Вышнего выносили из Задвинья у водинъ посадъ за Видьбу переносити*»: Там же. С. 203.
[21] ДМАМЮ. С. 203–204. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 754. У 1560-я гг. просьбы аб рамонце і забеспячэнні замкаў у Мсціславе і Радамлі неаднаразова падавала шляхта яшчэ аднага памежнага ваяводства ВКЛ – Мсціслаўскага: ДМАМЮ. С. 149–150, 501.
[22] ДМАМЮ. С. 194, 196. Акрамя таго, была агучана просьба накіраваць на Віцебшчыну войска ВКЛ, каб абараніць яе ад магчымага нападу з боку Маскоўскай дзяржавы.
[23] Падалінскі У. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Мінск, 2017. С. 94–96.
[24] Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. С. 97.
[25] AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 396. S. 1; Sygn. 450. S. 3. Пазней, у 1615 г. мсціслаўская шляхта таксама падкрэслівала значнасць замка ў Мсціславе – "*настолькі каштоўнага скарбу Рэчы Паспалітай*": AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 636. S. 1.
[26] Akta zjazdów... T. 2. S. 122. Адным з паслоў Полацкага ваяводства быў Яраш Корсак, а віцебскімі пасламі з'яўляліся мясцовыя земскі падсудак Рыгор Косаў і Аляксандр Ратамскі: AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 348a. S. 3.
[27] Akta zjazdów… T. 2. S. 130.

PolotskSU

Полацкая шляхта ў 1598 і 1606 гг. нагадвала каралю і вялікаму князю Жыгімонту Вазе аб яго Пактах канвента, у якіх абяцалася за каралеўскі кошт збудаваць у Рэчы Паспалітай і забяспечыць усім неабходным 5 замкаў. Абывацелі Полацкага ваяводства хацелі, каб адным з гэтых замкаў быў менавіта замак у Полацку[28]. На полацкім сойміку ў студзені 1598 г. была агучана скарга азярышчанскага старосты Міхала Друцкага-Саколінскага на недастатковае забеспячэнне замка ў Азярышчы і на нявызначаную мяжу з Маскоўскай дзяржавай у раёне Невеля, што вяло да пастаянных канфліктаў з маскоўцамі. У выніку, паслы павінны былі на сойме звярнуцца да Жыгімонта Вазы з просьбай даручыць каралеўскаму ганцу ўзняць пытанне аб мяжы на перамовах у Маскве[29].

Шляхецкія карпарацыі беларускага Падзвіння не толькі ўздымалі пастулаты аб умацаванні замкаў, але часам бралі справу абароны рэгіёну ў свае рукі, не чакаючы ўказанняў вышэйшых кіроўных колаў дзяржавы. Напрыклад, у 1565 г. віцебскія абывацелі «*накладомъ своимъ обваровали*» частку Верхняга замка ў Віцебску[30]. У 1570-я гг. павятовая шляхта з уласнай ініцыятвы, хаця і не падлягала такой павіннасці, за свой кошт адрамантавала частку віцебскага замка: «*забудовали того замку часть немалую, на самыхъ шанцахъ и приступе неприятельскомъ, отъ реки Двины, межи вежами новозабудоваными Успенскою и Пречистенскою*»[31]. Заўважым, што дзяржаўная ўлада стымулявала такую актыўнасць мясцовага насельніцтва. У 1566 г. Жыгімонт Аўгуст абяцаў вызваліць ад выплаты пагалоўнага падатку тых віцеблян, «*которие бы охотней и чуйней около роботъ замковыхъ пильность чынили …, острогъ робити и ровы копати будете*»[32]. Ініцыятыву ў павышэнні абароназдольнасці замкаў праяўлялі і вышэйшыя мясцовыя ўраднікі. Так, у 1569 г. віцебскі ваявода Станіслаў Пац за ўласны кошт вырабіў 3 гарматы для замка ў Віцебску[33].

Арганізацыя абароны ў значнай ступені залежала таксама ад асобы кіраўніка мясцовай адміністрацыі. І хаця намінацыя на такія пасады была прэрагатывай караля і вялікага князя, але шляхта імкнулася так ці інакш уплываць на кадравую палітыку манарха. Напрыклад, у 1589 г. вальны сойм Рэчы Паспалітай ухваліў канстытуцыю, згодна з якой у ВКЛ забаранялася надаваць памежныя замкі і судовыя староствы ў трыманне непаўналетнім асобам[34]. Звыш таго, у 1590-я гг. шляхта Полацкага

[28] AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 450. S. 3; Biblioteka Czartoryskich. Rkps. 2234. Nr. 51. K. 242. У 1598 г. шляхта суседняга Браслаўскага павета Віленскага ваяводства даручала сваім паслам у сувязі з хуткім заканчэннем перамір’я з Маскоўскай дзяржавай узняць на сойме пытанне аб рамонце і забеспячэнні зброяй памежных замкаў – Віцебска, Полацка і Браслава: AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 400. S. 1.

[29] Biblioteka Czartoryskich. Rkps. 2234. Nr. 51. K. 243. На сойме 1598 г. Полацкае ваяводства прадстаўлялі Пётр Стаброўскі і Якуб Сямашка: Падалінскі У. Соймавае прадстаўніцтва Полацкага ваяводства ў канцы XVI ст. Спроба аналізу. С. 155–156.

[30] ДМАМЮ. С. 193.

[31] Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею: В 5 т. Т. 3: 1544–1587 гг. СПб., 1848. С. 198–199.

[32] ДМАМЮ. С. 203. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 754.

[33] Archiwum książąt Sanguszków w Sławucie. T. 7: 1554–1572. Lwów, 1910. S. 335–336.

[34] Трымаць гэтыя годнасці маглі толькі сапраўды заслужаныя перад каралём і Рэч Паспалітай людзі: Volumina Constitutionum. T. II, vol. 2. S. 116. З вывучаемага рэгіёну пасламі на сойм 1589 г. абіраліся Міхал Друцкі-Саколінскі і Васіль Рэвут (Полацкае ваяводства), віцебскі харужы Іван Храпавіцкі і віцебскі земскі

PolotskSU



і Віцебскага ваяводстваў дабілася права рэальна ўдзельнічаць у выбарах мясцовых ваяводаў, што было прапісана яшчэ ў абласных прывілеях, нададзеных гэтым землям вялікімі князямі літоўскімі[35]. Часам шляхта магла скардзіцца манарху на ваяводу і, такім чынам, уплываць на яго дзейнасць. На вальным сойме 1559 г. віцебскія абывацелі скардзілася на ваяводу Стэфана Збаражскага, што той у час сваёй адсутнасці ў Віцебску нават у мірных абставінах прымушае іх з узброенымі атрадамі (почтамі) знаходзіцца пры замку. Жыгімонт Аўгуст прызнаў скаргу слушнай і загадаў ваяводзе, «*кгды потреба не вказуеть, жебы вамъ съ почътами вашыми пры замъку лежати не казалъ*»[36]. У 1569 г. паслы Віцебскага павета скардзіліся на злоўжыванні і перавышэнне паўнамоцтваў з боку ваяводы С. Паца. Каб высветліць справядлівасць гэтых абвінавачванняў, манарх паабяцаў прызначыць спецыяльных камісараў[37]. Незадаволенасць тым, як некаторыя вышэйшыя мясцовыя ўраднікі выконвалі свае абавязкі па абароне памежжа, гучала і ў мірны час. Напрыклад, на Галоўным сойміку 1596 г. у Слоніме ў праект агульнай інструкцыі для дэлегацыі ВКЛ на будучы вальны сойм Рэчы Паспалітай быў уключаны пункт аб тым, каб памежныя ваяводы і старосты пастаянна знаходзіліся на сваіх замках[38]. У 1598 г. шляхта Віцебскага павета прасіла віленскага ваяводу, вялікага гетмана ВКЛ Крыштафа Радзівіла Перуна нагадаць віцебскаму ваяводзе Мікалаю Сапезе аб неабходнасці асабіста знаходзіцца ў Віцебску, асабліва *"ў той час непакою"*[39].

З іншага боку, у сувязі са сваім небяспечным становішчам жыхары памежных зямель Вялікага Княства спрабавалі дасягнуць для сябе пэўных ільготаў у падаткаабкладанні. Калі сойм 1559 г. ухваліў у ВКЛ збор двухгадовай сярэбшчыны (надзвычайнага падатку на ваенныя патрэбы), то паслы Полацкага і Віцебскага ваяводстваў прасілі вялікага князя вызваліць іх ад яе выплаты. Пры гэтым, полацкія прадстаўнікі спасылаліся на свае прывілеі і вольнасці, а віцебскія – на сваё памежнае становішча: «*и впередъ николи на вас, яко на людехъ украинъныхъ, серебъшчызны брати казати не рачылъ*»[40]. Аднак гэтая просьба была Жыгімонтам Аўгустам адхілена, паколькі падатак ухваляўся не на гаспадарскія, а на агульнадзяржаўныя, земскія патрэбы ў вельмі складаных для ВКЛ міжнародных абставінах. Праўда пасля маштабных паходаў маскоўскіх войскаў па ўсходніх рэгіёнах ВКЛ у 1562–1564 гг. дзяржаўная ўлада была вымушана пайсці на некаторыя саступкі той мясцовай шляхце, якая найбольш пацярпела ад варожых нападаў. Да таго ж, шляхта Полацкага і Віцебскага ваяводстваў, значная

падсудак Бальцар Старасельскі (Віцебскі павет), аршанскі падкаморы Рыгор Сапега і Фёдар Друцкі-Горскі (Аршанскі павет): Codex diplomaticus Regni Poloniae et Magni Ducatus Lituaniae. T. 1. Vilnae, 1758. S. 239.

[35] Витебская старина / Составил и издал А. Сапунов. Т. 1. Витебск, 1883. С. 91–92; Галубовіч В. Полацкая шляхта і дынастыя Вазаў. С. 19–21. Гл. таксама: Макараў М.Дз. Ад пасада да магдэбургіі… С. 134–159.

[36] РИБ. Стб. 293. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 607.

[37] Падалінскі У. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года. С. 116. Пасламі з'яўляліся віцебскі земскі падсудак Цімафей Гурка і віцебскі гараднічы Пётр Кісель.

[38] Akta zjazdów… T. 2. S. 121.

[39] AGAD. AR. Dz. II. Nr. 396. S. 2.

[40] РИБ. Стб. 288, 292. Дададзім, што віцебскія паслы прасілі гаспадара, каб нормы выплаты сярэбшчыны і нясення земскай службы ў Віцебскім ваяводстве былі аднолькавыя з ваяводствам Полацкім: Там же. Стб. 293, 294. Аб падатку, ухваленым на сойме 1559 г., гл. напр.: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 594–597; Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. С. 213–214.

PolotskSU



частка якіх была акупавана і спустошана баявымі дзеяннямі, проста не магла несці падатковы цяжар на адным узроўні з іншымі рэгіёнамі ВКЛ[41]. Так, вальны сойм 1565–1566 г., з увагі на панесеныя страты, вызваліў ад выплаты пагалоўнага падатку некаторых «*Витблянъ и Мстиславцовъ*». Хаця ўсе станы ВКЛ на сойме адмыслова патрабавалі, каб ніхто на памежжы, у першую чаргу, ваяводы і старосты, не вызваляўся ад падаткаў[42]. На наступным сойме, які адбываўся ў Берасці ў 1566 г., віцебскія паслы прасілі Жыгімонта Аўгуста зноў вызваліць іх павет ад выплаты пагалоўшчыны. Аднак манарх гатовы быў надаць такія льготы толькі тым, хто будзе актыўна ўдзельнічаць у забеспячэнні абароназдольнасці замка ў Віцебску або не будзе мець магчымасці выплаціць пабор з-за знішчэння сваёй маёмасці, і толькі па прадстаўленні мясцовага паборцы[43].

Яшчэ адной сур'ёзнай праблемай была адсутнасць дакладнага размежавання абавязкаў па ўтрыманні памежных замкаў у належнай баяздольнасці паміж мясцовай дзяржаўнай адміністрацыяй, шляхтай і мяшчанствам, што, у сваю чаргу, выклікала адпаведныя канфлікты. У 1559 г. шляхта адмаўлялася рамантаваць частку «*пустовъскихъ*» гародняў у полацкім замку, паколькі раней гэтая павіннасць ляжала на насельніцтве захопленых маскоўцамі валасцей. Тым не менш, Жыгімонт Аўгуст прасіў шляхту толькі на адзін раз усё ж такі даць сваіх падданых для рамонту гародняў, бо «*тое роботы есть пильная потребе на сесъ часъ*»[44]. У кастрычніку 1598 г. віцебская шляхта скардзілася на мяшчан Віцебска, якія, па яе словах, пасля атрымання магдэбургскага права перасталі выконваць павіннасці па даглядзе і рамонце замкавых умацаванняў[45]. Гарадскія жыхары сапраўды далёка не заўсёды падтрымлівалі захады мясцовай адміністрацыі па арганізацыі абароны. Так, у 1558 г. полацкія мяшчане скардзіліся на ваяводу С. Давойну, што той хацеў разабраць і вывезці з тэрыторыі замка мяшчанскія дамы, а ў 1593 г. прасілі, каб тагачасны полацкі ваявода Мікалай Дарагастайскі не прымушаў іх несці вартавую службу пры замку[46].

Шляхта памежных рэгіёнаў Вялікага Княства Літоўскага, якая, хіба, найбольш цярпела ад вайны, прапаноўвала і канкрэтныя шляхі паляпшэння сітуацыі з забеспячэннем

---

[41] Напр., гл. памеры падатковых паступленняў у земскі скарб з паветаў і ваяводстваў ВКЛ за 1578–1579 гг.: Skarbowość w Polsce i jej dzieje za Stefana Batorego / Wyd. A. Pawiński. Warszawa, 1881. S. 467–469.

[42] Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 693; РИБ. Стб. 348, 364. Тым не менш, у 1560-я гг. гаспадар вымушаны быў вызваліць ад выплаты мытаў і падаткаў жыхароў найбольш пацярпелых ад вайны Суража, Оршы, Чачэрска, Прапойска, Шклова, Мсціслава: Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга 44: Кніга запісаў 44 (1559–1566) / Падрыхт. А.І. Груша. Мінск, 2001. С. 86; Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. С. 215.

[43] ДМАМЮ. С. 203–204. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 754. На сойме 1569 г. мсціслаўскія паслы таксама безвынікова спрабавалі дабіцца вызвалення свайго ваяводства ад выплаты новых падаткаў: ДМАМЮ. С. 502.

[44] РИБ. Стб. 289–290. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 606. Падобная спрэчка вакол рамонту замка ў Мсціславе ў 1559 і 1563 гг. ішла паміж мсціслаўскай шляхтай і мясцовымі старостам Іванам Саламярэцкім ды гараднічым Лукашам Стахоўскім: ДМАМЮ. С. 149–150; РИБ. Стб. 295–296.

[45] AGAD. AR. Dz. II. Nr. 396. S. 1–2. Гл. таксама: Rzońca J. Rzeczpospolita Polska w latach 1596–1599. Wybrane zagadnienia polityki wewnętrznej i zagranicznej / Wyższa szkoła pedagogiczna im. Powstańców Śląskich w Opolu. Studia i monografie, 156. Opole, 1990. S. 54–56.

[46] Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией: В 39 т. Т. 8: Акты виленского гродского суда. Вильна, 1874. С. 266–267; Варонін В. Войт-ваявода і мяшчане ў канфлікце 1558 г. у Полацку. С. 61–62. У 1559 г. староста І. Саламярэцкі хацеў разабраць у мсціслаўскім замку нават дамы шляхты: РИБ. Стб. 296.

PolotskSU



абароны дзяржавы. Ужо ў 1559 г. віцебскія прадстаўнікі настойвалі на тым, каб уся шляхта і ўраднікі, якія мелі ўладанні ў Віцебскім ваяводстве, неслі тут ваенную службу і ўдзельнічалі ў абароне замка. Асабліва падкрэслівалася, каб землеўладальнікі «*именьями своими головнейшыми не вымовляли ся*»[47], г.зн. не ўхіляліся ад нясення земскай службы менавіта на тэрыторыі ваяводства і не аслаблялі абарону памежжа. У 1565 г. віцябляне прапаноўвалі, каб раз на квартал перад мясцовым ваяводам праводзіўся агляд узбраення і асабовага складу конных, пешых і казацкіх рот, размешчаных у Віцебску: «*ижъ бы уставичне врадъ его королевское милости замковый ведалъ о готовости людей, яко на замку украинномъ*»[48]. Значна пазней, у 1598 г., праводзіць у паветах ВКЛ падобныя агляды ўзброеных сіл мясцовых абывацеляў *„для гатоўнасці да абароны"* прапаноўвала і полацкая шляхта[49]. Перад вальным соймам Рэчы Паспалітай 1597 г. шляхта Віцебскага павета самым хуткім і эфектыўным сродкам напаўнення дзяржаўнага скарба бачыла ўвядзенне ў Вялікім Княстве выплаты кварты (¼ часткі даходаў) з усіх без выключэння каралеўскіх уладанняў[50]. А ў інструкцыі паслам на сойм 1598 г., складзенай на сойміку ў Полацку, прапаноўвалася накіроўваць у земскі скарб, у тым ліку і на патрэбы абароны, 1/3 даходаў з дзяржаўных маёнткаў[51]. Праўда трэба прызнаць, што большасць падобных прапаноў аб павышэнні абараназдольнасці ўсходняга памежжа або не мела доўгатэрміновага характару, або ў той час так і не была рэалізавана.

Надзвычай цяжкай праблемай, з якой сутыкнулася шляхта паўночна-ўсходняй Беларусі ў ваенны час, сталі адносіны з жаўнерамі. У 1565 г. віцябляне скардзіліся на ротмістраў, што тыя прымалі ў свае роты мясцовых жыхароў, а фактычна спрыялі ўцёкам залежнага насельніцтва ад гаспадароў[52]. Была таксама пададзена скарга на ротмістраў у Віцебску і Суражы, якія не падпарадкоўваліся в.а. віцебскага ваяводы С. Пацу і не хацелі падлягаць яго суду[53]. Востра паўставала праблема забеспячэння войскаў харчаваннем. У той жа Віцебскай зямлі жаўнеры набывалі ў насельніцтва прадукты не па рынкавым кошце, а паводле "ўставы", г.зн. дакумента, у якім вызначаліся цэны, часта заніжаныя, на харчаванне для вайскоўцаў. Частку прадукцыі яны прымусова забіралі з валаснога жыхарства. У выніку, насельніцтва проста разбягалася з гарадоў і сёл. Кароль і вялікі князь мусіў строга загадаць ротмістрам, «*абы они живности в месте и по селахъ уставою не брали и приставствъ у волости жадныхъ не мели, и што будуть живности в месте брали, то абы ценою, а не уставою платили*»[54]. Тым не менш,

---

[47] РИБ. Стб. 291–292. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 606.

[48] ДМАМЮ. С. 194. Віцебская шляхта і мяшчане вызваліся ад удзелу ў гэтых аглядах.

[49] Biblioteka Czartoryskich w Krakowie. Rkps. 2234. Nr. 51. S. 241.

[50] Akta zjazdów… T. 2. S. 130.

[51] Biblioteka Czartoryskich w Krakowie. Rkps. 2234. Nr. 51. S. 241.

[52] ДМАМЮ. С. 193–194. На вальным сойме Рэчы Паспалітай 1569 г. паслы Мсціслаўскага ваяводства таксама выступілі са скаргай на ротмістраў, якія прымалі ў свае роты падданых мясцовай шляхты і ўхіляліся ад судовага разбіральніцтва такіх спраў: Падалінскі У. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года. С. 96–97.

[53] ДМАМЮ. С. 195. Гл.таксама: Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. С. 256.

[54] ДМАМЮ. С. 194. Гл.таксама: Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. С. 257–260. Жаўнеры, размешчаныя на Віцебшчыне, павінны былі атрымліваць харчаванне са складоў (шпіхлераў) у Барысаве і Магілёве.

PolotskSU

і ў наступным 1566 г. віцебская шляхта скардзілася на мясцовых жаўнераў, якія не заплацілі за ўзятыя на свае патрэбы «*збожья, быдла и иншихъ живностей*». На гэты раз Жыгімонт Аўгуст абяцаў кампенсаваць пацярпелым шляхцічам іх страты з гаспадарскага скарба, вылічыўшы сродкі з заробку вінаватых жаўнераў[55]. На сойме 1569 г. ужо ўся дэлегацыя ВКЛ прасіла манарха знайсці іншы сродак забеспячэння жаўнераў харчаваннем, «*окромъ приставствъ и обтяженя подданыхъ*»[56]. Шляхта мела прэтэнзіі і да некаторых канкрэтных ротмістраў. Напрыклад, у 1565 г. прадстаўнікі Віцебскага ваяводства скардзіліся на мясцовага ротмістра Роха Бяляўскага, які «*на тамошнемъ замку свари и ростырки починаеть*» і не плаціць за сабранае харчаванне. Відаць, асоба ротмістра была настолькі непрымальнай для абывацеляў, што яны прасілі гаспадара адклікаць Р. Бяляўскага з Віцебска, чаго і дабіліся[57].

У канфліктах паміж шляхтай і жаўнерамі часам маглі праяўляцца і супярэчлівыя стасункі паміж дзвюма саюзнымі дзяржавамі – Вялікім Княствам Літоўскім і Каронай Польскай. Так, для дапамогі ў барацьбе з Маскоўскай дзяржавай у ВКЛ, у прыватнасці, у Полацкую зямлю, прыбыў каронны вайсковы кантынгент на чале з Фларыянам Зэбжыдоўскім. Аднак гэта стварала і патэнцыйную магчымасць узнікнення разнастайных канфліктных сітуацый паміж палякамі і палачанамі. Таму ўжо ў чэрвені 1562 г. Жыгімонт Аўгуст камандзіраваў да Ф. Зэбжыдоўскага мясцовага шляхціча, гаспадарскага двараніна Баркулаба Корсака, які павінен быў выконваць ролю пасярэдніка паміж польскімі жаўнерамі і мясцовым насельніцтвам пры вырашэнні ўсіх канфліктаў. Акрамя таго, кароль і вялікі князь выдаў спецыяльную “ўставу”, паводле якой кароннае войска павінна было набываць харчаванне на Полаччыне[58]. Канфліктныя сітуацыі здараліся і пазней, ужо пасля заключэння Люблінскай уніі 1569 г. і ўтварэння супольнай Рэчы Паспалітай. Напрыклад, у кастрычніку 1579 г. полацкі ваявода М. Дарагастайскі скардзіўся падляшскаму ваяводзе, кароннаму гетману Мікалаю Мялецкаму на польскіх ротмістраў, якія ўціскалі ротмістраў ВКЛ, у прыватнасці, М. Друцкага-Саколінскага на замку ў Сушы[59].

Яшчэ ў пачатку Інфлянцкай вайны, каб умацаваць вайсковую дысцыпліну і не дапусціць «*опилства збыточного*» сярод жаўнераў, Жыгімонт Аўгуст выдаў спецыяльнае распараджэнне, згодна з якім «*во въсихъ замъкох украинныхъ, же ротъмистрове корчомъ посполитыхъ якъ в замъкох, такъ и на местех мети не маютъ*»[60]. Наколькі гэтая пастанова выконвалася ў рэчаіснасці сказаць даволі цяжка. Так, у 1562 г. мсціслаўская шляхта скардзілася на ротмістраў, якія ў Мсціславе «*на месте и на замку корчмы держать*»[61]. Тым не менш, як падаецца, шляхта памежных зямель дбала аб кантролі за вытворчасцю алкагольных напояў і падтрыманні належнага парадку ў час вайны. У 1565 г. віцебскія паслы прасілі манарха ўвогуле забараніць у Віцебску

[55] ДМАМЮ. С. 204. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 755.
[56] Падалінскі У. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года. С. 96.
[57] ДМАМЮ. С. 196.
[58] Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга 44. С. 41–46, 68–70.
[59] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 3214. S. 5–6.
[60] У чэрвені 1560 г. драбскі ротмістр Мальхер Немяроўскі скардзіўся, што полацкі ваявода С. Давойна забараняў яму трымаць карчму ў Полацку: Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 42 (1556–1562 гг.): Кніга запісаў № 42 (копія канца XVI ст.) / падрыхт. В.С. Мянжынскі. Мінск, 2015. С. 87–88.
[61] ДМАМЮ. С. 150–151. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 655–656.

PolotskSU



выраб і продаж гарэлкі, на што атрымалі станоўчы гаспадарскі адказ[62]. Дададзім, між іншым, што забарона ротмістрам утрымліваць корчмы была абумоўлена таксама імкненнем дзяржаўнай улады не дапусціць канкурэнцыі для тых корчмаў, якія трымалі "ўскраінныя" ваяводы і старосты. Як паведамляў у чэрвені 1574 г. аршанскі староста Ф. Кміта-Чарнабыльскі, у перыяд вядзення баявых дзеянняў яго карчма ў Оршы прыносіла штогадовы даход у 300 коп грошаў літоўскіх, а ў час перамір'я – толькі 170 коп грошай[63].

У час Інфлянцкай вайны шляхта паўночна-ўсходніх зямель ВКЛ даволі актыўна брала ўдзел у баявых дзеяннях. Няўдалы пачатак вайны прынёс мясцовай шляхце цяжкія страты, у тым ліку і маёмасныя. Захоп Полацка, акупацыя значнай часткі Полацкага і Віцебскага ваяводстваў прымусілі шляхцічаў пакідаць свае маёнткі і шукаць лепшай долі ў іншых землях Вялікага Княства[64]. Аб настроях у асяроддзі шляхты ўсходняга памежжа ВКЛ пасля разбуральнага паходу маскоўцаў 1562 г. і захопу імі Полацка ў 1563 г. яскрава сведчыць адзін з пастулатаў, агучаных пасламі Мсціслаўскага ваяводства на сойме ў Вільні ў маі–чэрвені 1563 г. Шляхта прасіла перасяліць іх сем'і ў глыб краіны, на больш бяспечныя землі: «*для убежища жонъ и детей вашыхъ шляхетскихъ тутъ у панстве его кр. милости у великомъ князьстве Литовскомъ где местце дати на выхованье*»[65]. Лёс шляхты-выгнанцаў станавіўся праблемай дзяржаўнага значэння. З'езд станаў ВКЛ у Мсцібогаве ў 1576 г. адной з умоў прызнання Стэфана Баторыя новым каралём польскім і вялікім князем літоўскім нават вылучыў пастулат аб маёмасным забеспячэнні той полацкай шляхты, чые ўладанні ў 1560-я гг. былі захоплены маскоўцамі[66]. Толькі ў канцы 1570-х гг. шляхцічы атрымалі шанец вярнуць свае ўладанні, што і было адной з прычын іх актыўнага ўдзелу ў ваенных кампаніях 1579–1581 гг. Кароль і вялікі князь Стэфан Баторый так ацэньваў удзел полацкай шляхты ў вызваленні Полацка ў 1579 г.: *«з милости своее ку намъ господару и речи посполитое… пры добываню того замъку Полоцъкого з рукъ неприятельских Московъскихъ… з нелитованемъ горла и маетъностей своих, яко добрые а верные рыцерские люди служили»*[67]. Акрамя таго, для некаторых шляхцічаў вайна стала магчымасцю палепшыць сваё матэрыяльнае становішча і ўвайсці ў шэрагі мясцовай палітычнай эліты. Напрыклад, сойм Рэчы Паспалітай 1581 г. зацвердзіў прывілей Стэфана Баторыя, які за ваенныя заслугі надаў ротмістру Васілю Няміры і яго нашчадкам "*вечным правам*" 12 сялянскіх "службаў" у Магілёўскім старостве (Аршанскі павет)[68]. Пасля гэтага В. Няміра актыўна ўключыўся

---

[62] Дазвалялася мець гарэлку ў доме, але толькі для ўласных патрэбаў, а не для продажу: ДМАМЮ. С. 195.
[63] Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. С. 78–81.
[64] Аб лёсе полацкіх выгнанцаў падрабязна гл.: Mienicki R. Egzulanci Połłoccy (1563–1580) // Ateneum Wileńskie. Czasopismo naukowe, poświęcone badaniom przeszłości ziem Wielkiego Księstwa Litewskiego / Red. K. Chodynicki. Rok. IX. Wilno, 1933–1934. S. 33–128. Гл. таксама: Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга 44. С. 95–99.
[65] Жыгімонт Аўгуст згадзіўся «*до часу слушного и до воли и ласки его кролевское милости*» размясціць жонак і дзяцей мсціслаўскай шляхты ў Свіслацкай воласці: ДМАМЮ. С. 151.
[66] Akta zjazdów… T. 1. S. 194.
[67] Лаппо И.И. Великое княжество Литовское от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Опыт исследования политического и общественного строя. Спб., 1901. Т. 1. С. 176–177.
[68] Księga Batoriańska. Zbiór dokumentów ku uczczeniu 350-letniej rocznicy zgonu króla Stefana Batorego / Oprac. R. Mienicki. Wilno, 1939. S. 24–26; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 454–455.

PolotskSU



ў грамадскае жыццё, удзельнічаў у працы Галоўнага з’езда ВКЛ у лістападзе 1587 г., каранацыйнага сойма 1587–1588 г., абіраўся дэпутатам Трыбунала, а ў 1588 г. атрымаў намінацыю на ўрад аршанскага войскага[69].

Аднак нават перамога ў Інфлянцкай вайне не гарантавала шляхце вяртання яе ўласнасці або ўзнагароды за актыўны ўдзел у баявых дзеяннях. Так, у 1580–1590-я гг. вядомы полацкі род Корсакаў дабіваўся кампенсацыі за тыя свае землі, якія засталіся ў складзе Маскоўскай дзяржавы ў выніку размежавання, праведзенага пасля заключанага ў студзені 1582 г. Ям-Запольскага перамір’я[70]. А на вальным сойме 1598 г. паслам Полацкага ваяводства даручалася прадставіць Жыгімонту Вазе заслугі мясцовага кашталяна Есіфа Корсака, які для дзяржавы “*здаўна значныя і верныя службы выяўляў, не шкадуючы жыцця і крыві, … на той ускраіне*”, але да гэтага часу слушнага “*забеспячэння і ўзнагароды ні ад Яго Каралеўскай Міласці, ні ад Рэчы Паспалітай не мае*”[71].

Нарэшце, важна адзначыць, што мясцовыя эліты асэнсоўвалі і сваё адметнае становішча ў межах усяго палітычнага народа ВКЛ і Рэчы Паспалітай, што выяўлялася ў асаблівым самавызначэнні: “*ўскраінныя людзі*”. Напрыклад, менавіта так акрэслівалі сябе віцебскія прадстаўнікі на вальным сойме 1559 г. у Вільні, а таксама ўдзельнікі перадсоймавага сойміка Віцебскага павета ў канцы снежня 1600 г.[72] Усведамленне свайго асаблівага становішча ўплывала і на прыярытэты ў палітычнай дзейнасці шляхты ўсходніх зямель Вялікага Княства Літоўскага. На першым месцы стаяла захаванне бяспекі на маскоўскім памежжы. Калі ў снежні 1600 г. віленскі ваявода і вялікі гетман К. Радзівіл заклікаў шляхту ВКЛ выходзіць у паспалітае рушэнне або наймаць жаўнераў ды накіроўвацца ў Інфлянты на вайну са шведамі, то ўдзельнікі павятовага сойміка ў Віцебску адназначна заявілі, што адправяцца туды толькі ў выпадку захавання трывалага перамір’я з Маскоўскай дзяржавай і забеспячэння надзейнай абароны памежных зямель Вялікага Княства[73].

Такім чынам, знаходжанне Полацкага і Віцебскага ваяводстваў на мяжы з Маскоўскай дзяржавай непасрэдным чынам вызначала прыярытэты ў сацыяльна-палітычнай дзейнасці мясцовых палітычных эліт. Першачарговую ўвагу шляхта надавала эфектыўнаму забеспячэнню абароны памежжа, а менавіта пытанню ўтрымання замкаў, а таксама ўрэгуляванню адносін з жаўнерамі і абароне маёмасных правоў асобных сваіх прадстаўнікоў. Акрамя таго, на дзейнасць шляхецкіх карпарацый беларускага Падзвіння ў другой палове XVI–пачатку XVII ст. уплывала ўсведамленне сябе “людзьмі ўскраіннымі” – асаблівай групай палітычнага народа ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

---

[69] Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства (другая палова XVI–першая палова XVII стст.) // Полацкія гістарычныя запіскі. Т. 2. 2005. С. 59; Akta zjazdów… T. 1. S. 279, 286, 291, 309; Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582–1696): spis / pod red. A. Rachuby. Warszawa, 2007. S. 78, 84, 90.

[70] «*Ойчизны их*» Пуповічы, Удра, Болагава, Горкі: Akta zjazdów… T. 2. S. 122; AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 196. S. 6–7; Biblioteka Czartoryskich. Rkps. 2234. Nr. 51. K. 243. Гл. таксама: Рэвізія Полацкага ваяводства 1552 года / Уклаў В. Варонін. Менск, 2011. С. 85, 104.

[71] Увогуле, полацкая шляхта надавала пільную ўвагу раздачы ў прыватныя рукі зямель свайго “*ўскраіннага*” ваяводства: Biblioteka Czartoryskich. Rkps. 2234. Nr. 51. K. 240.

[72] РИБ. Стб. 292; AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 421. S. 1.

[73] AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 421. S. 1–2. Гл. таксама: Herbst S. Wojna inflancka 1600–1602. Wyd. 2. Zabrze, 2006. S. 55–59.

PolotskSU



ЛІТАРАТУРА

1. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией : в 39 т. / предисл. И.Я. Спрогиса. – Вильна : Тип. А.Г. Сыркина, 1874. – Т. 8 : Акты виленского гродского суда. – XXV, 652, 83 с.
2. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею : в 5 т. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1848. – Т. 3. – 1544–1587 гг. – VIII, VI, 317, [31] с.
3. Бортнік, І. Сацыяльна-палітычныя каштоўнасці і нормы паводзін шляхты Полацкага ваяводства ў канцы XVI–пачатку XVII стст. паводле соймікавых інструкцый / І. Бортнік // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы VI Міжнар. навук. канф. (1–3 лістапада 2012 г.) : у 2 ч. – Ч. 1. – 2013. – С. 41–53.
4. Воронін, В. Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. / В.А. Варонін // Беларускі гістарычны агляд. – Т. 5, сш. 1. – 1998. – С. 27–64.
5. Варонін, В.А. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. : дыс. ... канд. гіст. Навук : 07.00.02 / В.А. Варонін ; БДУ. – Мінск, 2000. – 109 л.
6. Варонін, В. Войт-ваявода і мяшчане ў канфлікце 1558 г. у Полацку / В.А. Варонін // Соціум. Альманах соціальної історії. – 2007. – Вып. 7. – С. 59–65.
7. Витебская старина : в 5 т. / сост. и изд. А. Сапунов. –Витебск : Тип. Губернского правления, 1883. – Т. 1. – XXII, 668 с., ил.
8. Галубовіч, В. Полацкія ваяводы ў XVII ст. / В. Галубовіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – №11. – С. 37–42.
9. Галубовіч, В. Паслы Полацкага ваяводства ВКЛ на соймы Рэчы Паспалітай у 1558–1668 гг. / В. Галубовіч // Герольд-Litherland. – № 18. – Горадня-Менск, 2011. – С. 37–40.
10. Галубовіч, В. Miscellanea historica polocensia = Даследаванні па гісторыі Полаччыны XII–XVII стст. : манагр. / В. Галубовіч. – Гродна : ГДАЎ, 2014. – 224 с.
11. Галубовіч, В. Полацкая шляхта і дынастыя Вазаў / В. Галубовіч. – Мінск : А.М. Янушкевіч, 2016. – 224 с. : іл.
12. Документы Московского архива Министерства юстиции. – М. : Тов-во тип. А. Мамонтова, 1897. – Т. 1. – 569 с.
13. Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с., [22] арк. іл.
14. Лаппо, И.И. Великое княжество Литовское от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Опыт исследования политического и общественного строя / И.И. Лаппо. – Спб. : Тип. И.Н. Скороходова, 1901. – Т. 1. – XVI, 780 с.
15. Левко, О.Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: формирование и развитие / О.Н. Левко. – Минск : Бел. наука, 2004. – 280 с.
16. Любавский, М.К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М.К. Любавский. – М. : Университ. тип., 1900. – 850, 232, 72 с.

PolotskSU



17. Макараў, М.Дз. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV–першай палове XVII ст. / М.Дз. Макараў. – Мінск : Экаперспектыва, 2008. – 248 с.
18. Марзалюк, І.А. Магілёў у XII–XVIII стст. Людзі і рэчы / І.А. Марзалюк ; навук. рэд. Я.Р. Рыер. – Магілёў-Мінск : Веды, 1998. – 260 с.: іл.
19. Мелешко, В.И. Могилев в XVI–середине XVII в. / В.И. Мелешко ; под ред. З.Ю. Копысского. – Минск : Наука и техника, 1988. – 264 с.
20. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 44: Кніга запісаў 44 (1559–1566). / падрыхт. А.І. Груша. – Мінск : Арты-Фэкс, 2001. – 229 с.: іл.
21. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 42 (1556–1562 гг.): Кніга запісаў № 42 (копія канца XVI ст.) / падрыхт. В.С. Мянжынскі. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – 190 с.
22. Падалінскі, У. Соймавае прадстаўніцтва Полацкага ваяводства ў канцы XVI ст. Спроба аналізу / У. Падалінскі // Полацкі музейны штогоднік : зб. навук. арт. за 2010 г. / уклад. Т.А. Джумантаева, А.У. Шумовіч, Т.Р. Смірнова. – Полацк : НПГКМЗ, 2011. – С. 155–163.
23. Падалінскі, У.А. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай / У. Падалінскі ; навук. рэд. А.А. Радаман. – Мінск : А.М. Янушкевіч, 2017. – 240 с.
24. Пичета, В.И. Белоруссия и Литва XV–XVI в. (Исследования по истории соц.-экон., полит. и культ. развития) / В.И. Пичета. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1961. – 815 с.
25. Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці / рэд. Ю.С. Пшыркоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 248 с.
26. Радаман, А. Арганізацыя і склад полацкага земскага суда ў другой палове XVI–першай трэці XVII ст. / А. Радаман // Герольд-Litherland. – 2011. – № 18. Горадня-Менск. – С. 21–36.
27. Радаман, А. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства (другая палова XVI–першая палова XVII стст.) / А. Радаман, В. Галубовіч, Д. Вілімас // Commentarii Polocenses Historici-Полацкія гістарычныя запіскі. – Т.2. – 2005. – С. 51–61.
28. Русская историческая библиотека : в 39 т. / Акад. наук. Археогр. Комиссия / ред. И.И. Лаппо. – Юрьев : Изд-во Акад. наук, 1914. – Т. 30 : Литовская Метрика. Отдел первый–второй ; Ч. 3 : Книги публичных дел. – IV, 895, 48 с.
29. Рэвізія Полацкага ваяводства 1552 года / укл. В. Варонін. – Мінск : ARCHE, 2011. – 271 с.
30. Спірыдонаў, М. Полаччына ў сярэдзіне XVI ст. / М. Спірыдонаў // Commentarii Polocenses Historici-Полацкія гістарычныя запіскі. – Т.1. – 2004. – С. 5–19.
31. Якубаў, В. Міжканфесіянальныя канфлікты ў Полацкім ваяводстве (1550–1618 гг.) / В. Якубаў // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы : науч. сб.– Мінск : РИВШ, 2009. – Вып. 2. – С. 175–185.
32. Янушкевіч, А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. / А.М. Янушкевіч. – Мінск : Медисонт, 2007. – 356 с.
33. Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. – T. 1 : Okresy bezkrólewi / Oprac. H. Lulewicz. – Warszawa : Wydawnictwo Neriton, Instytut Historii PAN, 2006. – 437 s.

PolotskSU



34. Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. – T. 2 : Okresy panowań królów elekcyjnych XVI–XVII wiek / Oprac. H. Lulewicz. – Warszawa : Wydawnictwo Neriton, Instytut Historii PAN, 2009. – 452 s.
35. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 196. – Uchwała sejmiku żmudzkiego (1587).
36. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Nr. 301. – Uchwała sejmiku relacyjnego w Orszy (1595).
37. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Nr. 336. – List obywateli powiatu orszańskiego do K. Radziwiłła (1596).
38. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Nr. 346. – Instrukcja sejmiku orszańskiego na sejm 1596 r.
39. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 348a. – Protestacja posłów niektórych w Warszawie, na sejmie uczyniona (1596).
40. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 395. – List obywateli powiatu orszańskiego do Krzysztofa Radziwiłła (1598).
41. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 396. – List obywateli województwa witebskiego do Krzysztofa Radziwiłła (1598).
42. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 400. – Termina z instrukcji powiatu Brasławskiego (1598).
43. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 421. – List województwa witebskiego do Krzysztofa Radziwiłła (1600).
44. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 450. – Uchwała sejmiku relacyjnego w Połocku (1606).
45. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 636. – Postulata i petita posłów województwa mścisławskiego (1615).
46. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. Listy oryginalne. – Sygn. 3214. – Listy Mikołaja Dorohostajskiego, wojewody połockiego (1579–1588).
47. Archiwum książąt Sanguszków w Sławucie. – Lwów : Nakł. ks. R. Sanguszka, 1910. – T. 7 : 1554–1572. – XXVI, 435 s.
48. Biblioteka Muzeum Narodowego im. Książąt Czartoryskich w Krakowie. – Rkps. 2234. – Nr. 51. – Instrukcja sejmiku połockiego na sejm 1598 r.
49. Codex diplomaticus Regni Poloniae et Magni Ducatus Lituaniae. – Vilnae : Ex Typ. Regia, et Reipublicae, Coll. Scholarum Piarum, 1758. – T. 1. – [34], 623, [29] s.
50. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582–1696): spis / pod red. A. Rachuby. – Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2007. – 469 s.
51. Herbst, S. Wojna inflancka 1600–1602 / S. Herbst. – Wyd. 2. – Zabrze : Wydawnictwo inforteditions, 2006. – 253 s.
52. Księga Batoriańska. Zbiór dokumentów ku uczczeniu 350-letniej rocznicy zgonu króla Stefana Batorego / Oprac. R. Mienicki. – Wilno : Nakł. Uniwersytetu Stefana Batorego, 1939. – IX, 55 s.

PolotskSU



53. Mienicki, R. Egzulanci Połłoccy (1563–1580) / R. Mienicki // Ateneum Wileńskie. Czasopismo naukowe, poświęcone badaniom przeszłości ziem Wielkiego Księstwa Litewskiego / red. K. Chodynicki. – Rok. IX. – Wilno, 1933–1934. – S. 33–128.
54. Rzońca, J. Rzeczpospolita Polska w latach 1596–1599. Wybrane zagadnienia polityki wewnętrznej i zagranicznej / J. Rzońca / Wyższa szkoła pedagogiczna im. Powstańców Śląskich w Opolu. Studia i monografie, 156. – Opole, 1990. – 205 s.
55. Skarbowość w Polsce i jej dzieje za Stefana Batorego / Wyd. A. Pawiński. – Warszawa : Księg. Gebethnera i Wolffa, 1881. – XV, IX, 470 s.
56. Volumina Constitutionum / Do druku przygotowali S. Grodziski, I. Dwornicka i W. Uruszczak. – Warszawa : Wydawnictwo Sejmowe, 2005. – T. II (1550–1609), Vol. 1 (1550–1585). – 516 s.
57. Volumina Constitutionum / Do druku przygotował S. Grodziski, przedmowa W. Uruszczak. – Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe, 2008. – T. II (1550–1609), Vol. 2 (1587–1609). – 449 s.
58. Wolff, J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego (1386–1795) / J. Wolff. – Kraków : Druk. Anczyca i Spółki, 1885. – VII, 354 s.

## *THE INFLUENCE OF THE FRONTIER LOCATION ON THE POLITICAL ACTIVITIES OF NOBILITY CORPORATIONS OF THE POLATSK AND VITSEBSK VOIVODESHIPS IN 1558–1607*

*U. PADALINSKI*

*The study is devoted to the problem of the public activities of local political elites in the borderland situation both in conditions of war and in peacetime. It is concluded that the position of the Polatsk and Vitsebsk voivodeships on the border with the Muscovy had been directly determining the priorities in political activities of the local nobility communities. The nobility paid initial attention to the effective enforcement of castles defense capability, the normalization of relations with the soldiers and protect the property rights of noblemen. Suggestion that the Polatsk and Vitsebsk nobility corporations saw themselves as a special group of the political nation of the Grand Duchy of Lithuania and the Commonwealth is asserted in the article. The study's results are important for the comprehensive research of the GDL political history, as well as local elites and local government at the second half of the 16$^{th}$–early 17$^{th}$ century.*